**ДУК "Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма"**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за красавік 2018 г.

## Мерапрыемствы да Вялікодных свят

**6 красавіка**

У рамках праекта "Бібліятэка без межаў" у інфармацыйна-сэрвісным цэнтры цэнтральнай раённай бібліятэкі для падапечных Кобрынскага псіханеўралагічнага дома-інтэрната прайшла праваслаўна-літаратурная гадзіна "Пасхальная радость". Супрацоўнікі бібліятэкі пазнаёмілі гасцей з гісторыяй узнікнення свята, з праваслаўнымі традыцыямі і звычаямі святкавання Вялікдня, правялі віктарыну "Светлый праздник Воскресения".

ЦБ, 18 чал.

**11 красавіка**

Гасцямі праваслаўна-літаратурнай гадзіны «Пасха светлая, Пасха красная» сталі навучэнцы 8 класа СШ №1. Супрацоўнікі бібліятэкі пазнаёмілі прысутных з велікоднымі традыцыямі і звычаямі розных краін свету. Расказ бібліятэкараў суправаджаўся паказам мультымедыйнай прэзентацыі «Из глубины традиций». Напрыканцы мерапрыемства прысутныя прынялі ўдзел у віктарыне.

ЦБ, 46 чал.

**18 красавіка**

Бібліятэкай сумесна з клубам і нядзельнай школай храма Ушэсця Гасподня аграгарадка Гарадзец праведзены святочны вечар "Пасхальный перезвон". Дзеці і дарослыя глядзелі тэатралізаванае прадстаўленне "Настенькина Пасха", слухалі словы віншавання ад іерэя Георгія Чарвякоўскага і старшыні Гарадзецкага сельвыканкама Д. Н. Мiраненкі. Гучалі велікодныя спевы і вершы ў выкананні ўдзельнікаў дзіцячага вакальнага гуртка клуба і літаратурна-паэтычнай групы "Натхненне". Усім прысутным было прапанавана прыняць ўдзел у разнастайных конкурсах, віктарынах, тэматычных гульнях. Пераможцы і ўдзельнікі гульнявой праграмы атрымалі салодкія пачастункі.

Гарадзецкі філіял, 78 чал.

**18 красавіка**

Члены аматарскага клуба "Крынічка" сумесна з нядзельнай школай выступілі з тэатралізаваным прадстаўленнем "Царица-тропинка" і "Встреча с Богом". Дзеці расказалі пра гісторыю свята, разам з працаўнікамі Дома культуры выканалі велікодныя песні. Настаяцель Свята-Петрапаўлаўскага храма г. Кобрына айцец Аляксандр павіншаваў усіх прысутных са святам. Падрыхтавана кніжная выстава "В поисках святого и вечного" і выстава вырабаў "Рук золотых земные чудеса".

Залеская ПБ, 150 чал.

## Мерапрыемствы да Сусветнага Дня здароў'я

**5 красавіка**

Супрацоўнікі бібліятэкі правялі дыялог аб здароўі "Пять слагаемых здоровья" для падапечных дзённага знаходжання Кобрынскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Яны расказалі аб правілах асабістай гігіены, захаванні рэжыму дня, рацыянальным харчаванні, фізічнай актыўнасці, аб згубным уздзеянні шкодных звычак.

Напрыканцы мерапрыемства праведзена віктарына, паказаны мультфільм "Мойдодыр".

ЦБ, 18 чал.

**7 красавіка**

У час правядзення Дня здароў'я "Здоровым быть здорово!" вучні Балоцкай сярэдяй школы даведаліся пра паходжанне Сусветнага Дня здароў'я, як яго адзначаюць у розных краінах, адгадвалі загадкі спартыўнай тэматыкі, гулялі у інтэлектуальныя гульні. Працягам мерапрыемства сталі рухомыя гульні і эстафеты на школьным стадыёне.

Балоцкая ПБ, 31 чал.

**12 красавіка**

Бібліятэка сумесна з Домам культуры правялі літаратурна-гульнявую праграму "В гостях у Неболейки". Дзеці даведаліся, што значыць быць здаровым, моцным, дужым. Актыўна адказвалі на пытанні віктарын "Лекарственные растения", "Пословицы и поговорки о здоровье", "О здоровье от А до Я", ўдзельнічалі у разнастайных спартыўных конкурсах.

Буховіцкая ПБ, 35 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**1 красавіка**

У рамках праекта «Тэрыторыя інтэлекту» адбыўся турнір інтэлектуальнай гульні «Што? Дзе? Калі?» - «Кубак Гарадоў - 2018». У турніры спаборнічалі 7 каманд эрудытаў г. Кобрына і каманда з г. Бяроза.

З прывітальным словам да ўдзельнікаў гульні звярнуўся галоўны рэдактар раённай газеты "Кобрынскі веснік", старшыня Кобрынскай РА РГА "Белая Русь" Раман Мельнік. У напружанай барацьбе першае месца заняла каманда «Особое мнение» з горада Бяроза.

Партнёр гульні Pizza Italiana прадаставіў прыз для каманды пераможцаў гульні.

*Кобрынскі веснік. – 2018. – 25 красавіка. – С. 8.*

ЦБ, 50 чал.

**2 красавіка**

У бібліятэцы адбылося літаратурнае вандраванне "Літаратурнае падарожжа – гэта цікава і незвычайна". Юныя чытачы апынуліся на таямнічым востраве прыгод. Зазірнулі ў літаратурны камбуз, пазналі шмат цікавага ў віктарыне "Літаратурнае вандраванне". Выпрабавалі сябе ў ролі спрытных і адважных у конкурсе "Марская навука". Веды і кемлівасць

дапамаглі дзецям дабрацца да скарбу капітана Флінта, якое піраты аддалі дзецям пасля адказаў на пытанні, якія паказваюць на месцазнаходжанне скарбу.

Батчынская ПБ, 48 чал.

**3 красавіка**

На тэматычным вечары “В единстве наша сила”, прысвечаным Дню яднання народаў Беларусі і Расіі, навучэнцы СШ №1 г. Кобрына даведаліся пра гісторыю свята, пра дзяржаўныя сімвалы, пра літаратуру і славутасці двух брацкіх славянскіх дзяржаў. Мерапрыемства суправаджалася паказам відэапрэзентацыі “Беларусь и Россия: общая история, общая судьба”.

ЦБ, 23 чал.

**10 красавіка**

У час правядзення гадзіны мужнасці “Помни, чтобы жить”, навучэнцы пазнаёміліся з трагічнымі падзеямі, якія адбыліся на беларускай зямлі ў час Вялікай Айчыннай вайны 22 сакавіка 1943 года. З дапамогай слайд-прэзентацыі прысутныя здзейснілі віртуальную экскурсію па Дзяржаўнаму мемарыяльнаму архітэктурна-скульптурнаму комплексу “Хатынь”.У завяршэнні мерапрыемства прагледжаны фільм “И будет жить Хатынь”.

ЦБ, 82 чал.

**12 красавіка**

У цэнтральнай раённай бібліятэцы адбыўся Дзень творчай ініцыятывы “Есть идея”. Калегі дзяліліся ідэямі правядзення інавацыйных мерапрыемстваў, дэманстравалі прыклады інтэрактыўных мультымедыйных віктарын. Галоўны бібліёграф дала метадычныя рэкамендацыі па актывізацыі краязнаўчай работы. Заг. аддзелам бібліятэчнага маркетынгу падвяла вынікі работы бібліятэк ГУК за 1 квартал 2018 года.

ЦБ, 54 чал.

**13 красавіка**

Пасяджэнне клуба «Час і ты» - «Память пылающих лет» прымеркавана да Міжнароднага дня вызвалення вязняў канцлагераў. Супрацоўнікі бібліятэкі распавялі навучэнцам Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа пра канцлагеры, якія атрымалі асаблівую сумную вядомасць: Азарычы, Асвенцым, Трасцянец, Дахау, Саласпілс, Бухенвальд, Майданэк.

ЦБ, 46 чал.

**20 красавіка**

Інтэлектуальная гульня “Кубак МХМ” сабрала каманды эрудытаў перапрацоўчых прадпрыемстваў г. Кобрына і каманды пастаянных удзельнікаў гульняў. З прывітальным словам да прысутных звярнуўся галоўны рэдактар раённай газеты “Кобрынскі веснік”, старшыня Кобрынскай РА РГА “Белая Русь” Раман Мельнік. У напружанай барацьбе першае месца заняла каманда “Старики разбойники”, адна з самых моцных каманд горада. У музычных паўзах выступіла юная выканаўца Кузьміч Анастасія. Спонсары гульні арганізавалі дэгустацыю сваёй прадукцыі і далі прызы для каманд пераможцаў.

ЦБ, 60 чал.

**23 красавіка**

Таварыскі турнір інтэлектуальнай гульні “Што? Дзе? Калі?” адбыўся сярод Праваслаўных маладзёжных брацтваў у рамках праекта “Тэрыторыя інтэлекту”. У турніры спаборнічалі 4 каманды горада Кобрына і каманда горада Жабінкі. Кобрынская каманда “Ніка” атрымала заслужаную перамогу. Самадзейныя артысты В. Бордюг і А. Крупко ў музычных паўзах выканалі вакальныя нумары.

ЦБ, 42 чал.

**26 красавіка**

Выступленне ЛПГ “Рытм” – “Призраки мертвого города”, гасцямі якога сталі навучэнцы старэйшых класаў СШ №1 г. Кобрына, было прымеркавана да Міжнароднага дня памяці ахвяраў радыяцыйных аварый і катастроф.

Пра трагедыю, якая адбылася ў ноч 26 красавіка 1986 года, аб подзвігу людзей-ліквідатараў аварыі расказалі дзецям супрацоўнікі бібліятэкі. З дапамогай відэапрэзентацыі “Земля, израненная Чернобылем” дзеці даведаліся, як выглядае цяпер Чарнобыль і Прыпяць, якія наступствы для чалавецтва былі прынятыя пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

ЦБ, 56 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81